# Кандрат Крапіва

# 1896-1991



...І ў жніўні 1915 года мяне папрасілі пастаяць «за веру, цара і айчыну».

Нарадзіўся 22 лютага 1896 года ў вёсцы Нізок. Вучыўся ў царкоўнапрыходскай школе, у народным вучылішчы ў мястэчку Узда, у гарадскім вучылішчы ў Стоўбцах.

У 1913 годзе экстэрнам здаў экзамены на годнасць народнага настаўніка.

1930 год. Заканчвае Беларускі дзяржаўны універсітэт.

Кандрат Крапіва з жонкай

Аленай Канстанцінаўнай і бацькам Кандратам Міхайлавічам. 1930 год.



# Кандрат Атраховіч – сапраўднае прозвішча драматурга.

Так тлумачыць выбар псеўданіма

**Крапіва**

Я ў мастацкім агародзе
Толькі марная трава.
А якая? Смех, дый годзе:
Я — пякучка-крапіва.
Я расту вось тут пад плотам
І не так даўно ўзышла,
А ўжо многім абармотам
Рукі-ногі папякла...

1922 г.

Яго кожная байка была радаснай падзеяй для чытачоў



**Крапіва, безумоўна, вялікі майстар байкі і камедыі, але ён і добры лірычны паэт, і цудоўны бытапісец. Пісьменнік шырока глядзіць на жыццё і глыбока пранікае ў яго тайнікі: ён бачыць у ім і гераічнае, і трагічнае, і смешнае.**

**Пятро Глебка.**

# 1941 год.

З першага дня вайны
Крапіва працуе ў газеце
Красноармейская правда"
З 1943 года і да канца вайны
 рэдагуе газету-плакат
"Раздавім фашысцкую гадзіну"



З сынам Барысам. 1942 год.



**1933** г. П’еса “Канец дружбы”
**1939** г. П’еса “Хто смяецца апошнім”
**1943** г. П’еса “Проба агнём”
**1945** г. П’еса “Мілы чалавек”
**1948** г. П’са “З народам”
**1953** г. П’еса “Зацікаўленая асоба”
**1958** г. П’еса “Людзі і д’яблы”
**1972** г. Камедыя “Брама неўміручасці”

Ролю цёці Каці ў п’есе “Хто смяецца апошнім” выконвала наша зямлячка – артыстка Лідзія Іванаўна Ржэцкая.

Таксама у яго вельмі шмат вершаў
пра вайну.

# АПОШНЯЯ СТАЎКА ГІТЛЕРА

- Заядлы ігрок і упарты
Гітлер — фашысцкі пёс.
Паставіў усё ён на карту —
Гонар дзяржавы, свой лёс.

  Гебельс круціць шарманку,
  Значыць — у Гітлера туз;
  Крыкнуў ён хрыпла: «Па банку!
  Іду... на Савецкі Саюз».

  Мы адказалі: «Біта!
  Пад Растовам і пад Масквой...»
  Цяпер мы прымусім бандыта
  Расплаціцца сваёй галавой.
- ***1942***

Зброю к бою, партызаны!
Лезе ў хату госць нязваны,
Лезе к нам фашысцкі гад —
Лоб стальны, ды кволы зад.
Напралом прывык ён перці,
Хай жа прэ насустрач смерці,—
Для гасцей такіх у нас
Падрыхтованы прыпас:
З фронту — танкі ды гарматы,
З тылу — вілы ды гранаты,
З фронту — слаўныя палкі,
З тылу — вашыя штыкі.
Расквітаемся мы з гадам
Здружанымі сіламі:
Лоб стальны праб'ём снарадам,
Зад пранiжам вiламi.

# Кандрат Крапіва.

## 80-гадовы юбілей



Грамадскасць ушаноўвае 80-гадовага юбіляра. 1976 год.

# 1986 год. У дзень 90-годдзя.



# Уздзеншчына. Вёска Нізок – радзіма Кандрата Крапівы



У 1975 годзе прысвоена высокае званне Героя Сацыялістычнай Працы



## Кандрат Крапіва тройчы лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР

**1941** – за п’есу “ Хто смяецца апошнім ”
**1951** – за п’есу “ Пяюць жаваранкі ”
**1971** – за распрацоўку праблем беларускай дыялекталогіі

У **1956** годзе ў сувязі з **60**-годдзем нададзена званне народнага пісьменніка БССР